# Гарачае прывітанне слаўным ордэнаносцам!

## Сакратару ЦК КП(б)Б тав. Гікало
## Старшыні СНК БССР тав. Галадзеду

### ПІСЬМО МОЛАДЗІ КАЛГАСА «БАЯВІК»

**(перадана з Грэска па тэлефону).**

Мы, — комсамольцы, калгасная моладзь калгаса «БАЯВІК», Грэскага раёна, сабраўшыся сёння на масавы маладзёжны сход для распрацоўкі сталінскага статута сельскагас. ўдарчай арцелі, атрымалі радасную вестку аб тым, што БССР і яе кіраўнікі таварышы ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕД узнагароджаны саюзным урадам вышэйшай узнагародай — ордэнам Леніна.

Прыміце, Нікалай Фёдаравіч і Нікалай Матвеевіч, наша палкае комсамольска-калгаснае прывітанне ў сувязі з найвялікшай рэволюцыйнай узнагародай, якую атрымалі вы і працоўныя нашай рэспублікі пад вашым кіраўніцтвам.

Мы абавязваемся правесці веснавую сяўбу ў калгасе ў 12 дзён. Арганізаваць 8 комсамольска-маладзёжных звенняў на розных відах палявых работ у час пасеўнай і комсамольска-маладзёжны кантроль за якасцю сяўбы. Выпусцім к канцу навучальнага года ўсіх слухачоў комсамольскай школы з адзнакай не ніжэй, як на «добра».

Арганізуем брыгаду мастацкай самадзейнасці для культурнага абслугоўвання калгаснікаў у час пасеўнай. Выпусцім 4 кніганосцаў, якія будуць забяспечваць брыгады літаратурай і газетамі. Зробім спартыўную пляцоўку для спартыўнай работы і адпачынку калгаснай моладзі.

У сувязі з узнагародай БССР ордэнам Леніна і ўзятымі намі абавязкамі ў нашу арганізацыю падалі заяву аб уступленні ў комсамол 4 лепшых калгаснікі-ўдарнікі, з якіх дзве дзяўчыны працуюць на калгаснай ферме.

ПА ДАРУЧЭННЮ АГУЛЬНАГА СХОДА: А. ДАМІДОЎСКІ, М. ЦВІРКО, М. КРАСОЎСКІ, НАДЗЯ МАЛЬЧУК, ОЛЬГА ЗІНЬКОВІЧ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ